Акадэмія паслядыпломнай адукацыі

СУМЕСНЫ ПРАЕКТ «АД ЛАКАЛЬНЫХ ПРАЕКТАЎ – ДА МАСАВАЙ ПРАКТЫКІ»

НАРОДНАЯ Асвета

# У МІНУЛАЕ – ПА-СУЧАСНАМУ: З ВОПЫТУ АРГАНІЗАЦЫІ КВЕСТАЎ У ШКОЛЕ

## Рэалізацыя інавацыйнага праекта па ўкараненні этнакультурных тэхналогій для пашырэння і ўзбагачэння адукацыйнага асяроддзя ўстановы адукацыі



**К. А. Ждановіч,**
*намеснік дырэктара па вучэбнай рабоце Ждановіцкай СШ Мінскага раёна*

Многія сучасныя падлеткі любяць у вольны час удзельнічаць у разнастайных квестах, а многія настаўнікі выкарыстоўваюць гэтыя гульні для вырашэння шматлікіх адукацыйных і выхаваўчых задач. Менавіта таму прымяненне квестаў на ўроках і ў пазаўрочнай дзейнасці мы паставілі ў цэнтр увагі падчас рэалізацыі ў школе **інавацыйнага праекта «Укараненне этнакультурных тэхналогій для пашырэння і ўзбагачэння адукацыйнага асяроддзя ўстановы адукацыі»** (2018–2022 гг.).

Нашы педагогі мелі магчымасць павысіць узровень прафесійнай кампетэнтнасці праз удзел у рэспубліканскім фестывалі інавацыйнага педагагічнага вопыту «Інавацыі як стратэгія самаразвіцця», рэспубліканскім семінары «Педагагічны кейс як адукацыйны рэсурс», міжнародным форуме «Інавацыі ў адукацыі: траекторыя міжнароднага супрацоўніцтва». У нашай установе адукацыі была арганізавана работа метадычнага семінара і часовых творчых груп, праведзены педагагічныя саветы «Інавацыі ў адукацыі: чаканні і магчымасці», «Узаемасувязь эфектыўнага педагагічнага і інавацыйнага вопыту», «Даследчы метад навучання як асноватворчы метад педагагічнай дзейнасці» і «Павышэнне прафесійнай кампетэнтнасці настаўніка. Панарама інавацыйнага вопыту». Асаблівая ўвага надавалася папулярызацыі школьных традыцый, звязаных з захаваннем народных абрадаў і свят, і распрацоўцы шматлікіх тэматычных мерапрыемстваў. Напрыклад, да Міжнароднага дня роднай мовы вучні 9–11 класаў рыхтавалі флэш-моб «Нашы любімыя словы», удзельнікі якога атрымалі ў падарунак эмблему з выявай валошкі, а арганізацыя дня інавацыйнага праекта была нацэлена не толькі на ўдасканаленне майстэрства настаўнікаў, але і на далучэнне вучняў да ажыццяўлення даследчай дзейнасці.

Прадуктамі праекта сталі відэазапісы выступленняў нашых творчых калектываў на школьных конкурсах «Спяваем па-беларуску» (https://drive.google.com/drive/folders/1Y3hfjvLmogcktXttMtPNmlMibeiRt7Cb?usp=sharing) і «Art-гаспадынька» (https://drive.google.com/drive/folders/1Hfjm45rQ-FIOBfIgtBXoaljA0DGJc24M?usp=sharing). Творчая група настаўнікаў падрыхтавала серыю квестаў, накіраваных на выхаванне грамадзяніна і патрыёта, здольнага берагчы і памнажаць культурную спадчыну свайго народа. Так, пры правядзенні шэрага мерапрыемстваў, прымеркаваных да народных свят Каляды, Багач, Масленіца, вучні наведвалі музеі, удзельнічалі ў інтэрактыўных гульнях, вывучалі тэорыю і самі стваралі творчыя праекты.

У рамках рубрыкі «Інавацыйная пляцоўка» настаўнікі Ждановіцкай СШ дзеляцца эфектыўным педагагічным вопытам і прадстаўляюць аўтарскія матэрыялы, распрацаваныя падчас рэалізацыі інавацыйнага праекта.



# Прафесійная пераклічка

## Кулінарны квест «Нацыянальныя беларускія стравы»



**І. А. Несцяронак,**
настаўнік пачатковых класаў вышэйшай катэгорыі Ждановіцкай СШ Мінскага раёна

**І. С. Крышталевіч,**
настаўнік пачатковых класаў вышэйшай катэгорыі гімназіі № 6 г. Маладзечна імя С. Ц. Дзямешкі



**Мэты:** папулярызацыя беларускай нацыянальнай кухні; стварэнне беларускамоўнага асяроддзя, якое садзейнічае далучэнню малодшых школьнікаў да народнай культуры і традыцый праз знаёмства з нацыянальнымі стравамі; развіццё маўленчых і камунікатыўных якасцей навучэнцаў.

**Удзельнікі:** вучні 1–4 класаў.

**Ход кулінарнага квесту**

**І. Уводная частка**

Вучні дзеляцца на каманды і прыдумваюць ім назвы. Вядучы знаёміць дзяцей з ***умовамі гульні***: кожная каманда атрымлівае маршрутны ліст, у адпаведнасці з якім павінна будзе выконваць заданні на розных станцыях і атрымліваць за гэта падказкі-літары – з іх напрыканцы квесту патрэбна скласці слова *смачна*.

**ІІ. Асноўная частка**

**Станцыя 1.** Заданне: з дапамогай шыфру *17, 16, 19, 21, 5* дайце назву крыжаванцы і разгадайце яе (матэрыялы для крыжаванкі размешчаны на сайце часопіса www.n-asveta.by).

*Адказы.* Крыжаванка «Посуд». Словы па гарызанталі: 1) сподак, 5) бутэлька, 7) гарлач, 8) патэльня. Словы па вертыкалі: 2) кубак, 3) відэлец, 4) імбрычак, 6) талерка, 9) шклянка, 10) лыжка.

*Падказка-літара* – ***с.***

**Станцыя 2.** Заданне: аб'яднайце часткі сказаў і складзіце з іх прыказкі і прымаўкі.

*Адказы.* 1) На смачны кусочак *(знойдзецца раточак).* 2) Кашы маслам *(не сапсуеш).* 3) Вясна багата кветкамі, *(а восень пірагамі).* 4) Ад поліўкі *(ножкі тоненькі).* 5) Як капуста тлуста, *(то і ў жываце не пуста).* 6) Без кавалка хлеба *(кепская бяседа).* 7) Часам з квасам, *(а парою з вадою).*

*Падказка-літара* – ***м.***

**Станцыя 3.** Заданне: пазнаёмцеся з інфармацыяй пра віды беларускіх супоў (https://www.russianfood.com/recipes/bytype/?fid=2,165) і назавіце іх.

*Адказы.* Жур, юшка, поліўка, халаднік, крупеня, гарохавы, грыбны, малочны.

*Падказка-літара* – ***а.***

**Станцыя 4.** Заданне: прачытайце рэцэпты прыгатавання беларускіх страў і адгадайце іх назвы.

***Рэцэпты страў з бульбы***

1. 1,2 кг бульбы, 2 ст. лыжкі мукі, 0,5 шклянкі алею, соль. Абабраную бульбу надраць на тарцы, бульбяную масу адціснуць, дадаць муку, соль, перамяшаць і адразу смажыць аладкі на добра разагрэтай патэльні з алеем. Падаваць са смятанай, сметанковым маслам, скваркамі, мочанымі брусніцамі. *(Дранікі.)*

2. 1 кг бульбы, 80 г сала, 3 цыбуліны, 50 г тлушчу, соль. Абабраную бульбу зварыць у падсоленай вадзе, прапусціць праз мясарубку. Падскварыць сала, нарэзанае дробнымі кавалачкамі, разам з пакрышанай цыбуляй, перамяшаць з бульбай. З атрыманай масы сфармаваць невялікія шарыкі, абсмажыць іх на тлушчы, затым выкласці на патэльню і падсушыць у духоўцы. *(Камы.)*

*Падказка-літара* – ***ч.***

**Станцыя 5.** Заданне: «прыгатуйце» з прапанаваных кампанентаў напоі і вызначце іх назвы.

*Адказы.* 1) Бярозавы сок, цукар – *бярозавік*. 2) Вада, мёд, зёлкі, спецыі – *збіцень*. 3) Сухары, дрожджы, цукар, вада – *квас*. 4) Ягады, вада, цукар, крухмал – *кісель*. 5) Вада, садавіна ці ягады, цукар – *узвар*. 6) Вада, мята, засушаныя кветкі ліпы, галінкі маліны, парэчкі – *гарбата*.

*Падказка-літара* – ***н.***

**Станцыя 6.** Заданне: суаднясіце паміж сабой малюнкі, дзе адлюстраваны беларускія стравы і народныя святы.

*Адказы.* 1) Вялікдзень – пірагі, фарбаваныя яйкі. 2) Масленіца – бліны. 3) Дажынкі – каравай. 4) Гуканне вясны – птушачкі з цеста. 5) Багач – кош з агароднінай і садавінай. 6) Дзяды – куцця.

*Падказка-літара* – ***а.***

**III. Заключная частка**

Дзеці складаюць слова *смачна* і ўспамінаюць фразу, якую кажуць гасцям, калі садзяцца за стол: «Смачна есці!» Падвядзенне вынікаў, узнагароджванне каманд.

# QR-квест «Народныя мастацкія промыслы Беларусі»



**М. В. Даніліна,**
настаўнік гісторыі і грамадазнаўства
вышэйшай катэгорыі
Ждановіцкай СШ Мінскага раёна



**Р. Г. Чашун,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры
вышэйшай катэгорыі
Ждановіцкай СШ Мінскага раёна

**Мэты:** паглыбленне ведаў вучняў па беларускай мове, гісторыі, этнаграфіі і краязнаўстве; фарміраванне ў дзяцей этнакультурных кампетэнцый і крэатыўных здольнасцей; развіццё камунікатыўных навыкаў, умення працаваць у камандзе, выхаванне культуры зносін.

**Удзельнікі:** вучні 9–11 класаў.

**Ход QR-квесту**

**I. Уводная частка**

Вучні дзеляцца на каманды і прыдумваюць ім назвы. Вядучы знаёміць удзельнікаў з ***умовамі гульні***: каманды рухаюцца па індывідуальным маршруце і павінны на кожнай з чатырох станцый, атрымаўшы падказку, знайсці прадмет, дзе схаваны лісток з QR-кодам, перайсці па спасылцы на адпаведны электронны рэсурс, пазнаёміцца з прапанаванай інфармацыяй, адказаць на пытанні і зарабіць балы (ад 1 да 10).

**II. Асноўная частка**

**Станцыя «Разьба па дрэве».** Падказка: падумайце, якому святу супрацьстаяць Каляды ў гадавым коле, назавіце імя багіні гэтага свята і знойдзеце QR-код на адным са стэндаў (назва школьнага літаратурна-творчага аб'яднання пераклікаецца з назвай гэтага свята). *(Купалле.)*

Заданне: прачытайце артыкул «Разьба па дрэве», які можна знайсці па QR-кодзе, і адкажыце на ***пытанні***.

1. Што сімвалізуе дэкаратыўны матыў разетка, які да нашага часу выкарыстоўваецца разьбярамі па дрэве?

2. Якія часткі жылля ўпрыгожвалі скразной разьбой?

3. Якія вырабы можна стварыць з дапамогай аб'ёмнай або скульптурнай разьбы?

**Станцыя «Саломапляценне».** Падказка: гэты прадмет з'яўляецца сімвалам свята, яго шанавалі, выкарыстоўвалі пры сустрэчы дарагіх гасцей, падчас вяселля і іншых свят – знайдзіце ў кабінеце гэты прадмет і атрымаеце QR-код. *(Ручнік.)*

Заданне: прайдзіце па QR-кодзе, паглядзіце відэафрагмент пра саломапляценне і адкажыце, якое значэнне нашы продкі надавалі вырабам з саломкі; назавіце ўнікальны помнік мастацтва, створаны беларускімі майстрамі ў пачатку XIX стагоддзя, што захоўваецца ў Музеі беларускага народнага мастацтва ў Раўбічах. *(Царскія вароты.)*

**Станцыя «Выцінанка».** Падказка: QR-код вы зможаце знайсці, калі адшукаеце на стале прадмет, які называецца прас, і растлумачыце значэнне гэтага слова.

Заданне: азнаёмцеся з інфармацыяй, змешчанай пад QR-кодам, і адкажыце на ***пытанні***.

1. Што такое выцінанка?
2. Якія віды выцінанкі вызначаюць даследчыкі?
3. Якія хатнія рэчы ўпрыгожвалі выцінанкай?
4. Выцінанкі якога колеру часцей за ўсё ўжываліся на Беларусі?
5. У якім беларускім горадзе ў XX стагоддзі склалася цэлая дынастычная школа па выцінанцы?
6. Якімі нажніцамі і чаму любілі выразаць выцінанку беларускія майстры?

**Станцыя «Ганчарства».** Падказка: QR-код вы зможаце атрымаць, калі знойдзеце прыстасаванне для прыгатавання малочнага прадукту, які можна дабаўляць у многія стравы, але калядная куцця, напрыклад, абыходзілася без яго. *(Маслабойка.)*

Заданне: прачытайце артыкул «Ганчарства», выкарыстаўшы QR-код, і дайце адказы на ***пытанні***.

1. Які посуд нашы продкі называлі *спарыш*, альбо *парнік*, *двайнік*? Для чаго яго выкарыстоўвалі?
2. Якія гліняныя цацкі выраблялiся для дзяцей?
3. Пра якіх сучасных беларускіх майстроў-ганчароў вы даведаліся з артыкула?

**III. Заключная частка**

Падводзяцца вынікі мерапрыемства, узнагароджваюцца пераможцы.

# Квест-падарожжа «Праз смугу стагоддзяў»



**Т. А. Манцівода,**
настаўнік гісторыі і мастацтва
вышэйшай катэгорыі
Ждановіцкай СШ Мінскага раёна



**Г. А. Камарова,**
настаўнік матэматыкі і інфарматыкі
вышэйшай катэгорыі
Ждановіцкай СШ Мінскага раёна

**Мэты:** знаёмства вучняў з традыцыямі старажытнага народнага свята Багач, выхаванне ў дзяцей павагі да нацыянальнай спадчыны і культуры.

**Удзельнікі:** вучні 4–9 класаў.

**Падрыхтоўчы этап гульні:** пераагучванне мультфільма «Лёгкі хлеб» з рускай мовы на беларускую.

**Ход квесту-падарожжа**

**I. Уводная частка**

Удзельнікі дзеляцца на каманды, знаёмяцца з легендай і ***ўмовамі гульні:*** каманды адначасова пачынаюць рухацца згодна з маршрутным лістом; на кожнай станцыі патрэбна выканаць заданні, атрымаць адзнаку

настаўніка-кансультанта ў маршрутны ліст, узяць картку з літарай; напрыканцы квесту з літар неабходна скласці ключавое слова *Багач*.

***Легенда.*** Да нас сёння прыляцеў птах з далёкай мінуўшчыны і прынёс ліст, які напісаў адзін цікавы персанаж. Праўда, ён не прадставіўся. Калі вы здолееце адгадаць яго імя, ён зможа з глыбіні мінулых часоў хоць на адну гадзіну завітаць да нас у XXI стагоддзе і паглядзець, як мы жывём. Некалі ён быў у вялікай пашане: продкі нашы яго чакалі, сустракалі, святкавалі. Мянялася жыццё – дзесьці ў мінулым заблукаў наш невядомы персанаж, забылі пра яго беларусы. Давайце дапаможам яму і зладзім цікавы квест-падарожжа. Пяць дзівосных месцаў чакаюць вас, сябры, куды наш таямнічы персанаж праз птаха адправіў розныя падказкі-шыфры, якія разгадваюцца наступным чынам: кожную літару трэба замяніць на літару, якая знаходзіцца праз адну злева ў беларускім алфавіце.

**II. Асноўная частка**

**Прыпынак «Каравай».** Падказка-шыфр: ***мфнкпвтпвб мпкев***. *(Кулінарная кніга.)*

Заданне: «спячыце» каравай, выбраўшы патрэбныя інгрэдыенты.

***Інгрэдыенты:*** *разынкі,* цынамон, *разрыхляльнік,* кмен, *цукар, мука, дрожджы, яйкі, ваніль, малако,* цэдра лімона, *цукаты,* ядловец, агрэст, шыпшына, аксаміткі, бурштын.

**Прыпынак «Прыказкі».** Падказка-шыфр: ***ўнфовывнюпэ унрхпкм***. *(Тлумачальны слоўнік.)*

Заданне: у слоўніку знаходзіцца картка з тэкстам «646 старонка, 3 слупок, 12 артыкул» (слова *сявенька*); прачытайце значэнне прадстаўленага слова, знайдзіце ў памяшканні дадзены прадмет – побач з ім ляжыць картка з прыказкамі, якія трэба ўзнавіць, уставіўшы прапушчанае слова. (*Адказ:* рагач.)

1. Прыйшоў Багач – кідай…, бяры сявеньку ды сей памаленьку.
2. Багач – бярыся за…, ідзі пад авёс араць.
3. Багач заткнуў у страху…
4. Прыйшоў Багач – рыкнуў…

Слова «рагач» можа быць незнаёмым вучням, таму ім прапануецца атрымаць яшчэ адну падказку: «532 старонка, 2 слупок, 18 артыкул». Такім чынам дзеці даведаюцца, што ў беларускай мове сучаснаму слову *саха* адпавядае архаізм *рагач*.

**Прыпынак «Арнамент».** Падказка-шыфр: ***тфыпкм***. *(Ручнік.)*

Заданне: сабярыце з пазлаў арнамент, які сімвалізуе багацце; каб атрымаць яго элементы, адгадайце ***загадкі***.

1. Стаіць паніч дагары нагамі. *(Вілы.)*
2. Маленькі, гарбаценькі, а ўсё поле абскача. *(Серп.)*
3. Адна матка 12 сыноў мае, на ўсе націскае. *(Граблі.)*
4. Што нас корміць, а есці не просіць? *(Зямля.)*
5. Вісіць сіта круглавіта, залатое, навітое. *(Сонца.)*
6. Тысячы брацікаў звязаны, адным паяском падвязаны. *(Сноп.)*
7. Б'юць яго цапамі, рэжуць нажамі, за тое яго і лупяць, што ўсе вельмі любяць. *(Хлеб.)*

**Прыпынак «Лёгкі хлеб».** Падказка-шыфр: ***ўянждкйвт***. *(Тэлевізар.)*

Заданне: паглядзіце мультфільм «Лёгкі хлеб» і складзіце ланцужок з этапаў вырошчвання і прыгатавання хлеба.

**Прыпынак «Лён».** Падказка-шыфр: ***нзп***. (Лён.)

Заданне: паслухайце беларускую народную песню «Ох і сеяла Ульяніца лянок», выпішыце словы, звязаныя з апрацоўкай лёну, і расстаўце іх у парадку арганізацыі працэсу. *(Сеяла – палола – рвала – ставіла – слала – прала – ткала.)*

**III. Заключная частка**

Атрымаўшы ўсе літары, дзеці збіраюць слова *Багач*. Каб пазнаёміцца з традыцыямі дадзенага свята, ім прапануецца паглядзець відэасюжэт: https://www.youtube.com/watch?v=WEhmX-yfBaE.

## ЛІТАРАТУРА


1. **Краж, У. М.** Беларускія народныя гульні ў школе: вучэб.-метад. дапаможнік / У. М. Краж, В. В. Трубчык. – Маладзечна: Перамога, 1997. – 111 с.
2. **Сысоў, У. М.** З крыніц спрадвечных: пра каляндарную і сямейную абраднасць беларусаў / У. М. Сысоў. – Мінск: Вышэйшая школа, 1997. – 414 с.
3. **Хандрыка, С. В.** Беларуская народная культура на ўроках роднай мовы: 5 – 9 класы / С. В. Хандрыка. – Мазыр: Белы вецер, 2008. – 90 с.